# ГІСТАРЫЧНЫЯ ЎРОКІ МІСІЙ ААН У РУАНДЗЕ І ДЭМАКРАТЫЧНАЙ РЭСПУБЛІЦЫ КОНГА


**А. А. Валодзькін**

*Інстытут гісторыі НАН Беларусі,*
*вул. Акадэмічная, 1, 220072, г. Мінск, Беларусь, valodzkin@history.by*
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь, valodzkin@bsu.by*



Актуальнасць тэмы абумоўлена важным месцам міратворства ў структуры дзейнасці ААН, а таксама новай эскалацыяй канфлікту паміж Руандай і Дэмакратычнай Рэспублікай Конга з пачатку 2025 г. У артыкуле разглядаецца дзейнасць міратворчых місій ААН у абедзвюх гэтых краінах. Адлюстраваны гістарычны кантэкст і мэты кожнай з гэтых місій, тое, якім чынам Савет Бяспекі ААН рэагаваў на змены сітуацыі і да якіх вынікіаў вялі прынятыя ім рашэнні. Звяртаецца ўвага на тое, што некаторыя краіны выкарыстоўвалі гэтыя аперацыі ААН дзеля дасягнення сваіх асабістых мэт. У высновах адзначаюцца агульныя рысы і адрозненні гэтых дзвюх аперацый і параўноўваюцца іх ацэнкі. У высновах адзначаецца, што хаця абедзве аперацыі былі звязаны з разгортваннем у рэгіёне Вялікіх Афрканскіх азёр канфлікту паміж хуту і тутсі і пачыналіся як місіі па маніторынгу выканання пагадненняў аб перамір'і, ступень усведамлення ААН сур'езнасці сітуацыі значна адрознівалася, што ў выніку прывяло да рознай эффектыўнасці гэтых аперацый: калі місія ў Руандзе зараз ацэньваецца як цалкам правальная, то дзейнасць місіі ў ДРК выклікае неадназначныя ацэнкі.



***Ключавыя словы:*** міратворчыя аперацыі; Руанда; Дэмакратычная Рэпубліка Конга; Савет Бяспекі ААН; генацыд у Руандзе; Кангалезскія войны.

# ИСТОРИЧЕСКИЕ УРОКИ МИССИЙ ООН В РУАНДЕ И ДЕМОКРАТИЧЕСКОЙ РЕСПУБЛИКЕ КОНГО

**А. А. Володькин**

*Институт истории НАН Беларуси,*
*ул. Академическая, 1, 220072, г. Минск, Беларусь,*
*valodzkin@history.by*
*Белорусский государственный университет,*
*пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь,*
*valodzkin@bsu.by*

Актуальность темы обусловлена важным местом миротворчества в структуре деятельности ООН, а также новой эскалацией конфликта между Руандой и Демократической Республикой Конго с начала 2025 г. В статье рассматривается деятельность миротворческих миссий ООН в обеих этих странах. Отражены исторический контекст и цели каждой из этих миссий, то, каким образом Совет Безопасности ООН реагировал на изменение ситуации и к каким результатам приводили принятые им решения. Обращается внимание на то, что некоторые страны использовали данные операции ООН для достижения своих личных целей. В выводах отмечаются общие черты и различия этих двух операций, сравниваются их оценки. В выводах отмечается, что хотя обе операции были связаны с развертыванием в регионе Великих Африканских озер конфликта между хуту и тутси и начинались как миссии по контролю за выполнением соглашений о перемирии, степень осознания ООН серьезности ситуации существенно различалась, что в конечном итоге привело к разной эффективности этих операций: если миссия в Руанде сейчас оценивается как полностью провальная, то деятельность миссии в ДРК вызывает неоднозначные оценки.

***Ключевые слова:*** миротворческие операции; Руанда; Демократическая Республика Конго; Совет Безопасности ООН; геноцид в Руанде; Конголезские войны.

# COMPARATIVE CHARACTERISTICS OF THE UN MISSIONS IN RWANDA AND THE DEMOCRATIC REPUBLIC OF THE CONGO

**A. A. Valodzkin**

*Institute of History of the National Academy of Sciences of Belarus,*
*1 Akademicheskaya Street, Minsk 220072, Belarus, valodzkin@history.by*
*Belarusian State University,*
*4 Niezaliezhnasci Avenue, Minsk 220030, Belarus, valodzkin@bsu.by*

The relevance of the topic is due to the important place of peacekeeping in the structure of UN activities, as well as the new escalation of the conflict between Rwanda and the Democratic Republic of the Congo since the beginning of 2025. The article examines the activities of UN peacekeeping missions in both of these countries. It also reflects the historical context and goals of each of these missions, the UN Security Council responses to changes in the situation and the results of its decisions. Attention is drawn to the fact that some countries used these UN operations to achieve their own personal goals. The conclusions note the common features and differences of these two operations and compare their assessments. The conclusions note that although both operations were linked to outbreak of the conflict between Hutu and Tutsi in the African Great Lakes region and began as missions to monitor implementation of ceasefire agreements, the UN's degree of awareness of the seriousness of situation varied significantly, which ultimately led to different effectiveness of these operations: if the mission in Rwanda is now assessed as a complete failure, the activities of the mission in the DRC provoke mixed assessments.

***Keywords:*** peacekeeping operations; Rwanda; Democratic Republic of the Congo; UN Security Council; Rwandan genocide; Congolese wars.

У студзені 2025 г. сусветныя медыя паведамілі аб разрыве дыпламатычных адносін паміж дзвюма суседнімі краінамі – Дэмакратычнай Рэспублікай Конга (ДРК) і Руандай у выніку абвастрэння ўзброенага канфлікту ва ўсходніх раёнах першай з іх з удзелам другой. Гэтыя дзве

краіны злучае не толькі шматгадовая гісторыя этнічнага канфлікту паміж народамі хуту і тутсі, але і тое, што ў абедзвюх з іх (хоць і ў розныя гады) дзейнічалі міратворчыя місіі Арганізацыі Аб’яднаных Нацый (ААН) Міратворчая дзейнасць ААН з’яўляецца адным з важнейшых накірункаў працы гэтай арганізацыі з першых гадоў яе існавання. Добрым сведчаннем прызнання вялікага ўнёску міратворчых сіл ААН у справу забеспячэння міру ва ўсім свеце стала прысуджэнне ім Нобелеўскай прэміі міру ў 1988 г. Разам з тым пасля завяршэння халоднай вайны, змены сусветнага балансу сіл і асноўных прынцыпаў міжнародных адносін эфектыўнасць дзейнасці ААН пачала зніжацца і ў ёй абазначыліся крызісныя з’явы, што выклікалі шмат крытыкі ў адрас гэтай арганізацыі і патрабаванняў яе карэннага рэфармавання. Адной з найбольш яскравых тэндэнцый, што адлюстроўвалі гэтыя крызісныя з’явы, стала правядзенне на мяжы XX–XXI стст. шэрагу цалкам правальных міратворчых аперацый – місіі ў Босніі, Самалі і г. д. Таму мэтай гэтай працы з’яўляецца параўнаўчая характарыстыка міратворчых місій ААН у дзвюх суседніх краінах рэгіёну Вялікіх Афрыканскіх азёр.

Асноўнымі крыніцамі інфармацыі па вызначанай тэме з’яўляюцца дакументы ААН – напрыклад, рэзалюцыі Савета Бяспекі ААН аб стварэнні адпаведных місій і вызначэнні іх мандата, а таксама справаздачы Генеральнага сакратара ААН аб ходзе гэтых аперацый. Яшчэ адной цікавай крыніцай па дзейнасці Місіі па аказанні дапамогі Руандзе (*UNAMIR*) сталі апублікаваныя мемуары кіраўніка міратворчых сіл ААН у Руандзе канадскага генерала Р. Даллера [1]. Гістарыяграфію па тэме даследавання складаюць пераважна агульныя працы, прысвечаныя генацыду ў Руандзе і Другой кангалезскай вайне, а таксама пасляваенным канфліктам ва ўсходняй частцы ДРК, у якіх дзейнасць місій ААН з’яўляецца толькі адным з сюжэтаў. Да гэтай катэгорыі варта аднесці публікацыі такіх аўтараў, як Ж. Прунье [2] і І. У. Крывушын [3]. Сустракаюцца і пу-

блікацыі адмыслова прысвечаныя дзейнасці місій ААН у Руандзе і ДРК. Сярод іх варта вылучыць асобныя публікацыі Г. М. Сідаравай [4] і некаторых іншых аўтараў [5–6].

Пачатак Місіі ААН па аказанні дапамогі Руандзе (*UNAMIR*) быў пакладзены рэзалюцыяй Савета Бяспекі ААН № 872 (1993) ад 5 кастрычніка 1993 г., якая вызначыла яе мандат і паўнамоцтвы. Згодна з ёй галоўнай мэтай Місіі быў нагляд за выкананнем заключаных у жніўні 1993 г. Арушскіх пагадненняў паміж урадам Руанды, які цалкам кантраляваўся народам хуту і прадстаўляў выключна яго інтарэсы, і паўстанцкай групоўкай Руандыйскі патрыятычны фронт (РПФ) народа тутсі. Гэтыя пагадненні павінны былі пакласці канец грамадзянскай вайне, што доўжылася ў Руандзе з 1990 г., праз стварэнне новага кааліцыйнага ўраду, які б прадстаўляў палітычныя арганізацыі абодвух народаў. Адпаведна, *UNAMIR* павінна была ажыццяўляць кантроль за аховай правапарадку і забяспечваць бяспеку пры размеркаванні гуманітарнай дапамогі ў пераходны перыяд. Пры гэтым у мандаце ўсяляк падкрэслівалася нейтральная пазіцыя міратворцаў, адпаведна якой ім забаранялася ўступаць у ваенныя сутыкненні з канфліктуючымі бакамі і, ўвогуле, выкарыстоўваць зброю супраць мясцовага насельніцтва. Такая стрыманая пазіцыя ААН у дачыненні прымянення сілы пры ўрэгуляванні ўнутраных канфліктаў была абумоўлена вялікімі стратамі міратворцаў падчас нядаўняй аперацыі ў Самалі ў тым жа 1993 г. Ваенны кантынгент місіі *UNAMIR* складаўся з вайскоўцаў Бангладэш, Бельгіі, Ганы і некаторых іншых краін. Яго колькасць вагалася ад 2,5 тыс. напачатку да 0,4 тыс. на піку генацыду ў Руандзе, калі пасля забойства некалькіх міратворцаў некаторыя краіны адклікалі свае вайсковыя кантынгенты, і да 5,5 тыс. на завяршальным этапе [1; 7].

Такая абмежаванасць колькасці і мандату аанаўскага кантынгенту не дазволіла яму наладзіць эфектыўную ахову грамадзянскага насельніцтва, калі пасля гібелі прэзідэнта Ж. Хаб’ярэманы 6 красавіка 1994 г. ў Руандзе па-

чаўся генацыд супраць тутсі і памяркоўных хуту. Як пісаў пасля кіраўнік місіі генерал Р. Даллер, ён яшчэ з лістапада 1993 г. неаднаразова папярэджваў і Генеральнага сакратара ААН К. Анана, і створаны ў 1992 г. Дэпартамент аперацый па падтрыманню міра аб тым, што групоўкі радыкальных хуту (інтэрахамве) атрымліваюць зброю ад руандыйскай арміі і амаль адкрыта рыхтуюцца да агрэсіўных дзеянняў. З гэтай нагоды ён прасіў дазвол на правядзенне пошукаў сховішчаў зброі і прымусовага раззбраення гэтых радыкальных груповак. Аднак дазволу на гэта ён так і не атрымаў [1, с. 146].

Пасля пачатку генацыду супраць тутсі і памяркоўных хуту міратворцы пачалі ствараць зоны бяспекі, дзе б мірнае насельніцтва магло ўратавацца. Самай вядомай з іх стаў стадыён Амахора ў сталіцы краіны г. Кігалі. Пры гэтым у шарагу выпадкаў міратворцы не маглі, ці не жадалі забяспечыць бяспеку тых, хто шукаў паратунку пад іх аховай. Калі 11 красавіка Бельгія і Францыя прынялі рашэнне аб эвакуацыі сваіх грамадзян з Руанды, міратворчыя кантынгенты гэтых краін проста пакінулі аб'екты, што раней знаходзіліся пад іх аховай на волю арганізатараў генацыду ў выніку чаго тысячы людзей, якія шукалі там паратунку, былі забітыя [2, p. 244].

Савет Бяспекі ААН пасля пачатку генацыду ў Руандзе не толькі не пашырыў мандат *UNAMIR*, але і двойчы прымаў рашэнні аб скарачэнні міратворчага кантынгенту, каб мінімізаваць страты сярод міратворцаў. Толькі пасля перамог паўстанцаў з РПФ, што ставілі мэту спыніць генацыд супраць тутсі, у выніку якіх у маі–чэрвені 1994 г. значная тэрыторыя краіны апынулася пад іх кантролем, кантынгент місіі ААН зноў пачаў павялічвацца. Пасля таго як у ліпені таго ж году сілы РПФ занялі сталіцу Кігалі і генацыд быў фактычна спынены, задачы *UNAMIR* зноў змяніліся. На завяршальным этапе, ажно да заканчэння свайго мандату 8 сакавіка 1996 г. місія садзейнічала бяспечнаму вяртанню бежанцаў дадому і дзейнасці

створанага ў лістападзе 1994 г. Міжнароднага трыбунала па Руандзе. Пры гэтым некаторыя краіны выкарыстоўвалі мандат ААН дзеля дасягнення сваіх уласных мэт. Напрыклад, французскія міратворцы правялі летам 1994 г. асобную аперацыю «Біруза». Фармальна яна была накіравана на стварэнне гуманітарных карыдораў для вяртання ўцекачоў. Аднак насамрэч французы ўсяляк супрацьдзейнічалі ўсталяванню сіламі РПФ кантролю над заходняй мяжой Руанды і тым самым дапамаглі шматлікім арганізатарам генацыду ўцячы ў суседні Заір (зараз – ДРК), дзе яны стварылі свае ваенныя базы і пачалі рабіць адтуль рэйды на руандыйскую тэрыторыю [2, p. 292; 7].

Вынікам пераследу на тэрыторыі ДРК радыкальных хуту, што ўчынілі генацыд, войскамі новага руандыйскага ўраду, створанага на базе РПФ, стала Першая кангалезская вайна (1996–1997 гг.), у якой супраць радыкальных хуту і падтрымаўшага іх кангалезскага прэзідэнта Ж. Мабуту выступіла кааліцыя Руанды, Уганды, кангалезскіх паўстанцаў-тутсі і іншых груповак, апазіцыйных рэжыму Мабуту. Вынікам той вайны стала звяржэнне шматгадовага праўлення Ж. Мабуту і прыход да ўлады ў ДРК апазіцыйных сіл на чале з Л. Кабілай, які паабяцаў раззброіць фарміраванні радыкальных хуту, а паўстанцкія групоўкі мясцовых тутсі інтэграваць у кангалезскую армію. Аднак у хуткім часе паміж пераможцамі пачаліся рознагалоссі, што прывялі да Другой кангалезскай вайны (1998–2003 гг.). Яна стала самым крывавым ваенным канфліктам у гісторыі Афрыкі. Цягам яе загінула каля 5 млн чалавек. У вайне непасрэдна ўдзельнічалі: ДРК, Ангола, Намібія, Зімбабве, Судан і Чад – з аднаго боку, і Руанда, Уганда і Бурундзі – з другога. Таму яе яшчэ часам называюць Вялікай афрыканскай вайной [8, p. 194].

10 ліпеня 1999 г. у сталіцы Замбіі г. Лусака канфліктуючыя бакі заключылі перамір'е. і ўжо 15 ліпеня Генеральны сакратар ААН прапанаваў размясціць у ДРК міратворчую місію для назірання за выкананнем гэтага пагаднення. Ад-

паведна прынятай у жніўні таго ж году рэзалюцыі СБ ААН № 1258 у сталіцы краін, што яго падпісалі, былі накіраваны афіцэры сувязі. А рэзалюцыяй № 1279 ад 30 лістапада 1999 г. была створана міратворчая Місія ААН у ДРК (*MONUC*). Першапачаткова мандат гэтай місіі ўключаў назіранне за спыненнем агня, развядзенне канфліктуючых бакоў ад лініі фронту і забеспячэнне сувязі паміж усімі падпісантамі пагаднення аб перамір'і. Пазней яе мандат быў пашыраны і уключыў адсочванне выканання ўсіх пунктаў пагаднення аб спыненні ваенных дзеянняў, а таксама шэраг іншых задач па забеспячэнню бяспекі мірнага насельніцтва і спыненню гвалту падчас лакальных канфліктаў на ўсходзе ДРК [4, с. 102].

Рэзалюцыяй № 1291 ад 24 лютага 2000 г. Савет Бяспекі ААН санкцыянаваў разгортванне ў ДРК міратворчага кантынгенту колькасццю звыш 5,5 тыс. вайскоўцаў. Свае вайсковыя падраздзяленне для гэтай місіі прадаставілі каля 30 краін з розных кантынентаў. А камандуючым сіламі ААН у ДРК быў прызначаны сенегальскі генерал М. Дыялла. Разгортванне місіі пачалося напрыканцы 2000 г. у 13 пунктах па ўсёй краіне. І ўжо напачатку 2001 г. былі дасягнуты першыя поспехі па адсоўванню канфліктуючых бакоў ад лініі фронту. Аднак праз вялізныя памеры краіны і працягласць лініі фронту сіл *MONUC* не хапала ні на абарону грамадзянскага насельніцтва, ні нават на эвакуацыю грамадзянскага персаналу ААН. Таму міратворцы засяродзіліся пераважна на ахове крытычных аб'ектаў гуманітарнай дапамогі ад марадзёрства. Акрамя таго яны дапамагалі аднавіць судаходства па рацэ Конга і расследавалі выпадкі парушэння рэжыму спынення агня [8, с. 199].

Пасля падпісання 20 ліпеня 2002 г. у Прэторыі мірнага пагаднення паміж прэзідэнтамі ДРК і Руанды сілы *MONUC* ажыццяўлялі кантроль за вывадам войск Руанды і Уганды з кангалезскай тэрыторыі. Аднак пасля вываду замежных войск сітуацыя ва ўсходніх раёнах ДРК толькі пагоршылася, бо ў правінцыях Ітуры (у 2003 г.) і Ківу (у 2004 г.) акты-

візавалі баявыя дзеянні мясцовыя паўстанцкія групоўкі, якія здзейснілі шэраг нападаў і забойстваў міратворцаў ААН. У адказ Савет Бяспекі ААН прыняў некалькі рэзалюцый аб павелічэнні колькасці міратворчага кантынгенту і аб пашырэнні яго мандату. У 2005 г. колькасць сіл ААН дасягнула 16 тыс. чалавек і ім было дазволена выкарыстоўваць ваенныя сродкі дзеля правядзення баявых аперацый супраць паўстанцаў з мэтай іх раззбраення. Да таго ж у дапамогу *MONUC* ЕС па ініцыятыве Францыі правёў у 2003 г. у ДРК сваю дадатковую міратворчыю аперацыю «Артэміс» [4, с. 105].

У 2006 г. яшчэ адной задачай *MONUC* стала дапамога ў арганізацыі парламенцкіх і прэзідэнцкіх выбараў у ДРК і забеспячэнне бяспекі падчас іх правядзення. Як адзначае Г. М. Сідарава, важную ролю ў іх падрыхтоўцы ў 2003–2006 гг. адыгрываў створаны пад кіраўніцтвам гэтай місіі Міжнародны камітэт падтрымкі пераходнага перыяду. Ён неаднаразова выконваў функцыі медыяцыі каб прадухіліць перарастанне супярэчнасцяў паміж удзельнікамі пераходнага кааліцыйнага ўраду ДРК у аднаўленне ўзброенага канфлікту. Пасля выбараў місія ААН працягнула сваю працу ў краіне, выконваючы ў адпаведнасці з мандатам Савета Бяспекі ААН шэраг задач у галіне забеспячэнне бяспекі і вяршынства права, а таксама па ўрэгуляванню лакальных канфліктаў у некалькіх правінцыях ДРК. Паколькі з-за гэтых лакальных канфліктаў, што перыядычна ўспыхвалі ў розных правінцыях, сітуацыя з бяспекай у краіне заставалася складанай, Савет Бяспекі сваёй рэзалюцыяй № 1925 ад 1 ліпеня 2010 г. працягнуў мандат міратворчай місіі ўжо пад новай назвай – Місія ААН па стабілізацыі ў ДРК (*MONUSCO*). Пры гэтым і яе кантынгент, і мандат былі яшчэ больш пашыраны. А асноўныя акцэнты дзейнасці змешчаны ў бок аховы грамадзянскага насельніцтва, гуманітарнага персаналу і правоў чалавека. *MONUSCO* працягвае сваю дзейнасць да цяперашняга часу [9].

Такім чынам, параўноўваючы дзейнасць і вынікі абедзвюх місій можна зрабіць наступныя высновы. Іх правядзенне было звязана з рознымі фазамі развіцця канфлікту паміж этна-сацыяльнымі групамі хуту і тутсі ў рэгіёне Вялікіх Афрыканскіх азёр. Місія *UNAMIR* праводзілася калі гэты канфлікт яшчэ быў лакалізаваны пераважна ў межах Руанды, а *MONUC* – калі пасля генацыду ў Руандзе і Бурундзі ён разам з бежанцамі перамясціўся на тэрыторыю ДРК і справакаваў самы маштабны ваенны канфлікт у посткаланіяльнай гісторыі Афрыкі – Другую кангалезскую вайну.

Мандат абедзвюх місій пачынаўся з маніторынгу выканання пагадненняў аб перамір'і. Аднак далейшае іх развіццё прынцыпова адрознівалася. Місія *UNAMIR*, нягледзячы на паступаўшыя папярэджанні аказалася цалкам непадрыхтаванай да эскалацыі канфлікту і пачатку генацыду ў Руандзе – больш за тое, на піку генацыду, калі рашучае ўмяшальніцтва міратворцаў было патрэбна як ніколі, Савеці Бяспекі адзінагалосна прымае рашэнне аб скарачэнні міратворчага кантынгенту да мінімуму. А некаторыя краіны ўвогуле выкарыстоўвалі гэтую місію для вырашэння сваіх ўласных задач: Бельгія – дзеля эвакуацыі з Руанды сваіх грамадзян, не зважаючы на страты мясцовага насельніцтва, а Францыя – дзеля супрацьдзеяння РПФ і выратавання некаторых арганізатараў генацыду. Гэтую сітуацыю можна патлумачыць тым, што ААН была дэмаралізавана нядаўняй паразай сваіх аперацый у Босніі і Самалі, а ўвага пастаянных членаў Савета Бяспекі была засяроджана на канфліктах на тэрыторыі былой Югаславіі, постсавецкай прасторы і Блізкім Усходзе. Адпаведна падзеі ў Руандзе апынуліся амаль цалкам паза іх увагай. Таму і рэакцыя ААН была запозненай і часам цалкам неадэкватнай.

Місія *MONUC* разгортвалася ўжо ў іншых умовах. Па-першае, стала зразумела, што канфлікт у рэгіёне Вялікіх Афрыканскіх азёр не толькі не спыніцца сам сабой, але і

дэманструе выразную тэндэнцыю да пашырэння. Па-другое, вострая фаза канфліктаў на Усходзе Еўропы на той момант была ўжо пераадолена і усе яны былі альбо ўрэгуляваны палітычнымі сродкамі, альбо надзейна замарожаны. Але галоўнае, менавіта ў гэты час ЕС, рыхтуючыся да свайго самага буйнога пашырэння і ўзмацнення палітычнага складніку еўрапейскай інтэграцыі, імкнуўся заявіць аб сабе як аб сур’ёзным цэнтры сілы ў сусветнай палітыцы і важным донары міжнароднай бяспекі. Таму да місіі ААН у ДРК краіны ЕС праявілі куды большую ўвагу, чым да місіі ў Руандзе. Таму яны была арганізавана значна лепш – падтрымку міратворцам аказвалі прадстаўніцтвы Праграмы развіцця ААН і шэрагу іншых аанаўскіх структур. А галоўнае, калі ў 2003–2004 гг. адбылася эскалацыя канфліктаў у Ітуры і Ківу СБ ААН аператыўна прыняў рашэнне аб павелічэнні міратворчага кантынгенту і пашырэнні яго мандату дзеля правядзення рашучых ваенных аперацый супраць парушальнікаў міру ў гэтых рэгіёнах.

Калі місія ААН у Руандзе ўсімі ацэньваецца як правальная, ацэнкі місіі ў ДРК вельмі розняцца. Адны адзначаюць, што за працяглы перыяд свайго правядзення яна так і не здолела пакласці канец канфліктам у ДРК, а з улікам памераў краіны, колькасць міратворчага кантынгенту такая ж недастатковая, як і раней ў Руандзе. Іншыя звяртаюць увагу на тое, што толькі дзякуючы гэтай місіі ДРК увогуле яшчэ існуе як адзіная дзяржава і не распалася на мноства частак, паміж якімі б непазбежна пачаліся новыя канфлікты.

## Бібліяграфічны спіс


1. Dallaire, R. Shake Hands with the Devil: the Failure of Humanity in Rwanda / R. Dallaire. – London : Arrow Books, 2005. – 562 p.
2. Prunier, G. The Rwanda Crisis: History of a Genocide / G. Prunier. – London : C. Hurst & Co. Publishers, 1998. – 424 p.
3. Кривушин, И. В. Сто дней во власти безумия: Руандийский геноцид 1994 г. / И. В. Кривушин. – М. : Издат. дом ВШЭ, 2015. – 527 с.

4. Сидорова, Г. М. Международная поддержка мирных усилий в Демократической республике Конго в переходный период (2003–2006 гг.) / Г. М. Сидорова // Вестник СПбГУ. Востоковедение и Африканистика. – 2011. – № 4. – С. 102–108. – URL: https://aasjournal.spbu.ru/article/view/2620 (дата обращения: 12.04.2025).

5. Казанцева, А. Ю. Опыт проведения миротворческой миссии ООН в Руанде: проблема соотношения ценности человеческой жизни и национальных интересов государств / А. Ю. Казанцева // Практики воспроизводства ценностей: гуманитарный, социальный и экономический аспекты : материалы Всерос. науч. конф., Екатеринбург, 14–15 нояб. 2019 г. – Екатеринбург : Изд-во Уральск. ун-та, 2020. – С. 122–124.

6. Де Сейта, Л. Ограничения применения политических инструментов миротворческой деятельности ООН: на примере Руандийского конфликта 1990–1994 годов / Л. Де Сейта // Социально-гуманитарные знания. – 2024. – № 10. – С. 207–211. – URL: https://socgum-journal.ru/upload/iblock/a74/a48u2vtlfzaj0kx6eeiyed74shnktq2v/_%D0%A1%D0%93%D0%97_10_2024_11-12-24.pdf (дата обращения: 12.04.2025).

7. 100 Days of Slaughter: A Chronology of U.S./U.N. Actions. // PBS. – URL: http://www.pbs.org/wgbh/pages/frontline/shows/evil/etc/slaughter.html (date of access: 12.04.2025).

8. Reyntjens, F. The Great African War: Congo and Regional Geopolitics, 1996–2006 / F. Reyntjens. – Cambridge : Cambridge University Press, 2009. – 339 p.

9. Миссия Организации Объединенных Наций по стабилизации в Демократической Республике Конго // Операции ООН по поддержанию мира. – URL: https://peacekeeping.un.org/ru/mission/monusco (дата обращения: 12.04.2025).